■ Падзея

# Сярод лясоў наднарачанскіх

## Помнік Максіму Танку адкрываецца сёння ў Мядзеле



**Першы ў Беларусі помнік Максіму Танку адкрываецца 5 снежня на плошчы імя Шаранговіча ў горадзе Мядзел. Скульптурная кампазіцыя ўяўляе сабой бронзавую фігуру паэта ў поўны рост на гранітным пастаменце. Побач — валун з выявай у выглядзе разгорнутай кнігі з выбітымі радкамі з верша паэта «Ёсць адна песня песняў — пра Радзіму».**

Конкурс на стварэнне эскізных праектаў помніка быў аб'яўлены ў 2012 годзе да 100-годдзя з дня нараджэння паэта. Лепшымі прызнаны работы скульптараў Івана Міско і Аляксандра Фінскага і архітэктара Армэна Сардарава.

У гэты дзень беларуская творцы, прадстаўнікі грамадскасці і ўлады наведаюцца ў вёску Новікі, каб ушанаваць памяць паэта. Тут, на старых могілках, Максім Танк пахаваны разам са сваёй вернай спадарожніцай жыцця — жонкай Любоўю Андрэеўнай. Не абмінуць госці і музей Танка ў Сваткаўскай сярэдняй школе. Абноўленая экспазіцыя прысвечана жыццёваму і творчаму шляху песняра. Тут сабраны рэдкія выданні кніг паэта, разнастайныя дакументы, фотаздымкі, а таксама прадметы сялянскага побыту.

У Мядзельскім гарадскім Доме культуры адбудзецца паэтычная гасцёўня «Усё ўзяла душа без берагоў» з удзелам прадстаўнікоў Саюза пісьменнікаў Беларусі. У фае райвыканкама прысутныя азнаёмяцца з выставай з фондаў Музея гісторыі беларускай літаратуры, а таксама паслухаюць канцэрт у выкананні Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра Беларусі імя Жыновіча.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**

# СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.10 | 16.49 | 7.39 |
| Віцебск — | 9.07 | 16.32 | 7.25 |
| Магілёў — | 9.00 | 16.39 | 7.39 |
| Гомель — | 8.49 | 16.44 | 7.55 |
| Гродна — | 9.24 | 17.06 | 7.42 |
| Брэст — | 9.17 | 17.15 | 7.58 |

**Месяц**

*Поўня 6 снежня.*
*Месяц у сузор'і Блізнят.*

**Імяніны**

***Пр.*** *Аляксандра, Аляксея, Максіма, Міхаіла, Паўла, Пятра, Уладзіміра, Фёдара.*
***К.*** *Хрысціны, Генрыха.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі — 5 СНЕЖНЯ

**1914** год — 100 гадоў таму нарадзіўся (вёска Сяліба, цяпер Бярэзінскі раён) Рыгор Няхай, беларускі пісьменнік. У 1939 годзе скончыў Мінскі настаўніцкі інстытут. Працаваў у газеце «Літаратура і мастацтва», часопісе «Полымя», Дзяржаўным выдавецтве БССР. Аўтар паэтычных зборнікаў «Маё пакаленне», «Вялікі мой і ціхі акіян», аповесцяў «Героі не адступаюць», «Туман над стэпам» і іншых. Пісаў таксама для дзяцей, працаваў як перакладчык. Памёр у 1991 годзе.

**1945** год — у раёне Бермудскага трохвугольніка ў паўночнай Атлантыцы бясследна зніклі пяць самалётаў-тарпеданосцаў. Палёт авіязвяна з пяці паветраных машын пачаўся ў 14.00, а ў 15.15, пасля адпрацоўкі вучэбна-баявога задання, самалёты ўзялі курс на сваю базу Форт-Лодэрдэйл на паўвостраве Фларыда. Раптам кіраўнікі палёту пачулі дзіўнае паведамленне ад камандзіра авіязвяна лейтэнанта Чарльза Тэйлара: «Здаецца, мы збіліся з курсу! Зусім не відаць зямлі!». На прапанову дыспетчара ляцець на захад, каб выйсці са злавеснага «трохвугольніка», Тэйлар адказаў: «Мы не ведаем, дзе захад! Складваецца ўражанне, што і акіян выглядае неяк незвычайна!». Паколькі радыёсувязь перарвалася, на дапамогу церпячым бедства паспяшаўся выратавальны гідрасамалёт «Марцін Марынер», але і ён знік гэтак жа нечакана! Выходзіць, што ўсяго за некалькі гадзін амерыканскія ваенна-паветраныя сілы страцілі шэсць самалётаў і 27 чалавек экіпажаў і выратавальнага персаналу, прычым без усялякіх відавочных прычын! Анамальная зона і сёння лічыцца адным з самых загадкавых месцаў на планеце.



**1949** год — 65 гадоў з дня нараджэння (г. Мінск) Уладзіміра Васільевіча Магільнага, беларускага фізіка, доктара фізіка-матэматычных навук (1998). У 1972 годзе скончыў БДУ, працуе ў ім. Аўтар навуковых прац па працэсах пераўтварэння аптычных уласцівасцяў малекулярных ансамбляў і рэгіструючых асяроддзяў пад дзеяннем аптычнага выпраменьвання, стварэнню і эксперыментальнаму вывучэнню новых палімерных фотарэгіструючых матэрыялаў для запісу рэльефных, фазавых і палярызацыйна-фазавых малюнкаў.

**Было сказана**

**Алесь РАЗАНАЎ, паэт, перакладчык:**

*«Такое маўчанне ў снезе, такая далеч, такая бель — што заміраe душа: не ўмее яна яшчэ быць такой».*




## УСМІХНЕМСЯ

**У наш час сучасных тэхналогій навучыліся рабіць настолькі выдатныя дзіцячыя цацкі, што з дзіцячых крам з крыкамі і скандаламі сталі выходзіць не толькі дзеці, але і іх бацькі.**

— Як лепш прыгатаваць перапёлак?
— А колькі іх у цябе?
— Адна.
— Аддай кату, ён разбярэцца.

**Каб быць геніяльным урачом, як доктар Хаус, патрэбны веды і сарказм. Для працы ў раённай паліклініцы хопіць сарказму.**

— Што такое верх аптымізму?
— Сказаць: «Пайду зайду на хвілінку ў паліклініку».

**Пакуль я не заспела мужа з палюбоўніцай, свята верыла ў тое, што нельга біць ляжачых, голых і нагамі...**

З дзяцінства яна марыла пра шыкоўныя дарагія аўтамабілі і багатых мужчын, якія б прыносілі ёй пачкі грошай.

Вырасла, і яе мара спраўдзілася — яна касір у аўтасалоне.

**У цырульню ўвальваецца моцна зарослы мужык:**

**— Падстрыжыце, як у мінулы раз!**

**Цырульнік:**

**— Гэта не да мяне, я тут усяго год працую.**



caricatura.ru

**НАРОДЖАНЫЯ 5 снежня**

**Гэтыя людзі пераканaны ў тым, што ажыццявяць запланаванае, што яны здольны на грандыёзныя здзяйсненні. Аднак ім вядомыя і паражэнні. Яны шчыра зацікаўлены тым, што робяць у гэты момант, і шчодра падзяляюць вынікі сваёй працы. Большасць з іх параўнальна вольныя ад клопатаў і сумненняў, якія звычайна не даюць спакою іншым людзям. Ім неабходна засвоіць правіла, што думкі іншых людзей таксама штосьці значаць. Абавязковай умовай развіцця асобы тых, хто нарадзіўся ў гэты дзень, павінна стаць выпрацоўка цвёрдага і рэалістычнага ўяўлення аб сваім месцы і мэце свайго жыцця. Пакуль гэтага не адбудзецца, яны будуць заўсёды вагацца і сумнявацца, і, нягледзячы на ўласцівы ім аптымізм, іх будуць суправаджаць расчараванні.**

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар—галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.149. Індэкс 63850. Зак. № 4875.

Нумар падпісаны ў 19.30 4 снежня 2014 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12